Падтрымай "Вясну" на PATREON

Чарговы штраф Мікалаю Саляніку. На гэты раз – за непадпарадкаванне міліцыі

03.01.2019 **Тэгі**: суды, свабода мірных сходаў



Мікалай Салянік у судзе.

У Гародні ў судзе Кастрычніцкага раёну прайшоў чарговы адміністрацыйны працэс над актывістам Мікалаем Салянікам.

На гэты раз старшыню гарадзенскай філіі АГП судзілі за непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі (артыкул 23.4 КаАП), калі тыя сёмага лістапада спрабавалі затрымаць Саляніка каля яго дома.

Сведкамі па справе выступілі міліцыянты Кастрычніцкага РАУС **Юрый Сярко** і **Аляксей Панамароў**. У выніку суддзя **Валерый Шпак** пастанавіў аштрафаваць Саляніка на 10 базавых велічынь (255 рублёў).

Нагадаем, Мікалай Салянік разам з актывістам **Аляксандрам Лаўрэнцевым** у дзень угодкаў бальшавіцкага перавароту выйшлі на цэнтральныя вуліцы Гародні з плакатам "Долой самодержавие!". Супрацоўнікі міліцыі пільнавалі актывістаў яшчэ з раніцы, каб яны не маглі далучыцца ў афіцыйную

калону мітынгоўцаў. Мікалай Салянік нават быў затрыманы. Але ўрэшце актывісты ўсё ж выйшлі на плошчу Леніна з плакатам. Пастаяўшы там, яны скіраваліся на Савецкую плошчу. Там, у раёне гандлёвага дому "Нёман" іх гвалтоўна затрымалі і адвезлі ў РАУС.

Пазней Саляніку стала кепска, і ўжо ўвечары яго забралі ў шпіталь. Аляксандр Лаўрэнцеў застаўся на ноч у ізалятары, і на наступны дзень яму прысудзілі 30 базавых велічынь штрафу.

Твитнуть





ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне

ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY